Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 18 (260) | Пятніца, 1 чэрвеня 1956 года. | Цана 20 кап.

## АБАВЯЗАК СТУДЭНТАЎ—ВЫДАТНАЯ ВУЧОБА
## ПЕРШЫЯ РАДАСЦІ
## *АДСТАЮЧЫХ НЕ ПАВІННА БЫЦЬ*

## ВУЧОБА—ГАЛОЎНАЕ Ў ЖЫЦЦІ СТУДЭНТАЎ

Адзвінелі апошнія званкі. Другі семестр навучальнага года закончан. І цяпер, калі праслуханы сотні лекцый на самых розных галінах навукі, калі перачытаны тысячы старонак літаратуры, настала самая адказная пара—пачалася летняя экзаменацыйная сесія. Надышоў час, калі ўвесь калектыў універсітэта павінен даць справаздачу перад Радзімай за праведзеную гадавую работу.

Экзаменацыйная сесія — гэта праверка ўсёй работы не толькі студэнтаў, але і прафесарска-выкладчыцкага складу. Яна падводзіць вынікі мінулага семестра, паказвае поспехі і недахопы ўсёй вучэбнай работы.

На многіх факультэтах сесія пачалася яшчэ ў пачатку мая месяца. І першыя дні яе паказалі, што большасць студэнтаў глыбока і паспяхова авалодвае ведамі, упорна і настойліва вывучае навуку ўсіх навук—марксісцка-ленінскую тэорыю, дыялектычны і гістарычны матэрыялізм. Вынікі экзаменаў па гэтых прадметах сведчаць, што веды студэнтаў глыбокія і пераважная ацэнка—«выдатна».

Зараз, у дні сесіі, калі гутарыш з выкладчыкамі або перагортваеш экзаменацыйныя ведамасці, ганарышся дасягненнямі. Радуюць поспехі студэнтаў IV курса хімічнага факультэта. У іх экзаменацыйная сесія ўжо закончана. Сістэматычная, упорная работа на працягу ўсяго семестра дала добрыя вынікі: на курсе 16 выдатнікаў, 17 студэнтаў здалі сесію добра і выдатна. І толькі адна здавальняючая адзнака. Факультэт ганарыцца такімі студэнтамі, як Н. Арыка, В. Бычкова, І. Станкевіч, Л. Сукала. Добра здаюць студэнты геолага-геаграфічнага факультэта Т. Гурынская, Л. Дук, С. Бурдо, А. Еутух.

Між тым, экзамены выкрылі і буйныя недахопы ў вучэбна-выхаваўчай рабоце на радзе факультэтаў.

Дацэнт Л. М. Шнеерсон вымушан быў адправіць з экзамена па гісторыі міжнародных адносін некалькі студэнтаў IV курса аддз. журналістыкі, таму што іх веды былі павярхоўнымі, слабымі. А студэнтка гэтага-ж курса Панова двойчы здавала гэты прадмет—і двойчы яе веды нельга было ацаніць нават здавальняючай адзнакай. Чым можна растлумачыць той факт, што ў аўдыторыі, дзе студэнты II курса першай групы аддз. журналістыкі здавалі экзамен па тэорыі і практыцы партыйнага і савецкага друку, былі знойдзены кіпы шпаргалак, канспектаў, вырваных з падручнікаў лістоў? Толькі прабелам у выхаваўчай рабоце (комсорг курса П. Беражкоў, адказны за палітыка-выхаваўчую работу ў групе аспірант Б. Міцкевіч).

Нямногім больш васьмі месяцаў займаецца на першым курсе біелага-глебавага факультэта Анатоль Балабаеў. Якія-ж яго поспехі? Адказ могуць даць экзаменацыйныя ведамасці: першы экзамен—«нездавальняюча», асновы марксізма-ленінізма—не здаваў, бо не падрыхтаваўся, а ў ведамасці па анатоміі чалавека праф. Юньеў вымушан быў напісаць: «Не з'явіўся». Такое-ж становішча і ў студэнта II курса біяфака Ю. Сержаніна. «Здавальняюча» або «нездавальняюча»—вось усё, што можна ўбачыць у яго заліковай кніжцы.

Авалодваючы ведамі, студэнты не павінны абмяжоўвацца вывучэннем толькі падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Трэба паглыбляць свае веды шляхам штодзённай работы над навуковай літаратурай. Іменна гэты недахоп і перашкодзіў А. Сасноўскай, Е. Багдан, А. Клімовіч, Т. Валодзька (II курс біяфака), Э. Князевай, Н. Каленік (IV курс аддз. журналістыкі), Э. Дамарацкаму, Г. Клябанаву (II курс аддз. журналістыкі), В. Самсонавай, Л. Шманавай (I курс аддз. геаграфіі), І. Малец, А. Талер (IV курс аддз. геалогіі) даць поўнацэнныя адказы на экзаменах.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што ёсць яшчэ студэнты, якія падыходзяць да экзаменацыйнай сесіі з нетрывалымі ведамі, спадзяючца на «авось», на «шчаслівы» білет.

Партыйныя і комсамольскія арганізацыі факультэтаў, выкладчыкі не вядуць на працягу ўсяго семестра барацьбу за глыбокія і трывалыя веды. І нават бываюць выпадкі, калі выкладчыкі ліберальнічаюць, стараюцца «ўзняць» паспяховасць шляхам завышэння адзнак. Такое становішча недапушчальна.

Неабходна звярнуць увагу на той факт, што экзамены на многіх факультэтах, у прыватнасці на юрыдычным, філалагічным, хімічным, прымаюцца без асістэнтаў, хоць было прамое ўказанне рэктара прымаць экзамены толькі пры наяўнасці асістэнтаў.

Адмоўна адбіваецца на ходзе сесіі і слабая арганізаванасць. Выкладчык тав. Крыўчык, прышоўшы к 9 гадзінам прымаць экзамен, 2 гадзіны хадзіла разам са студэнтамі ў пошуках свабоднай аўдыторыі.

Дэканам і грамадскім арганізацыям факультэтаў неабходна зрабіць вывады з усіх—вялікіх і малых—недахопаў, якія выкрыліся ў першыя дні сесіі. Не павінны забываць свае задачы і рэдкалегіі насценных газет. Яны абавязаны арганізаваць выпуск спецыяльных бюлетэняў і «маланак», аператыўна адлюстроўваць ход сесіі. У насценных газетах, бюлетэнях і «маланках» трэба выкрываць і бічаваць усё, што адмоўна ўплывае на ход сесіі, а таксама папулярызаваць дасягненні выдатнікаў вучобы, іх вопыт.

Задача ўсяго калектыву БДУ заключаецца ў тым, каб завяршыць экзаменацыйную сесію з высокімі паказчыкамі. Для гэтага ў нас ёсць усе магчымасці.

## У ГІСТОРЫКАЎ

Мы на заліку ў студэнтаў II курса гістарычнага факультэта.

Яны здаюць курс «Гістарычны раман у зарубежных літаратурах новага часу».

Гэты курс шэраг гадоў спецыяльна распрацоўваецца кафедрай зарубежных літаратур універсітэта і, па сведчанню кіраўнікоў практыкай студэнтаў, аказвае будучым гісторыкам немалую карысць. Ды гэта адчуваецца і на заліку. Вось адказвае С. Сцяпанюк. Ён упэўнена расказвае аб гістарычным значэнні рэалізма Бальзака, не толькі прыводзячы выказванне Ф. Энгельса аб «Чалавечай камедыі», але і прымяняючы яго да пэўных раманаў вялікага пісьменніка. Студэнт Антонаў даволі правільна перадае змест аповесцей Лу Сіня, растлумачвае, у якім сэнсе Мао Цзэ-дун увёў у публіцыстычны ужытак слова «акюізм». Студэнтаў Корпік і Беркова не бянтэжаць дадатковыя пытанні, якія гістарычныя асобы Расіі паказаны Байранам у «Дон Жуане» або якія творы Стэндаля гавораць аб італьянскіх рэвалюцыянерах.

Але мы паграшылі-б супраць ісціны, прамаўчаўшы аб тых, хто блытаўся ў двух хвоях, бо трох-чатырох аўтараў не ведаў грунтоўна. Так атрымалася ў Міхалап, які блытаў Заля і Бальзака, а таксама і многія гістарычныя падзеі. Студэнтка Краснеўская настолькі блытана расказвала аб раманах В. Гюго, што ніяк не магла сказаць, які-ж з Людовікаў паказан у рамане «Сабор Парыжскай богамацеры». Дарэмна экзамінатар Н. І. Лапідус дараваў ім гэта. На другім курсе самы час праявіць поўную меру павагі да здольнасцей студэнта, г. зн. праявіць сур'ёзную патрабавальнасць.

## Што паказаў адзін экзамен

Экзамен па заалогіі беспазваночных на біялагічным факультэце лічыцца адным з цяжэйшых. Сапраўды, заалогія беспазваночных, што чытаецца на I курсе, ахоплівае вельмі вялікі і разнародны матэрыял, які складае неабходную аснову для далейшага вывучэння заалогіі на наступных курсах. Вялікі аб'ём фактычнага матэрыялу можа быць засвоен толькі ў тым выпадку, калі зразумелы той заканамерны парадак, які ляжыць у аснове класіфікацыі жывёл, што патрабуе ўжо ад студэнтаў не толькі запамінання, але і разумення. Таму на экзамене па заалогіі беспазваночных добра выяўляюцца здольнасці і асаблівасці студэнтаў.

За час працы ў БДУ я асабіста прыняў экзаменаў па заалогіі беспазваночных больш чым ад 250 студэнтаў, большая частка з якіх ужо скончылі БДУ, другія вучацца на старшых курсах.

Экзамен па заалогіі беспазваночных у гэтым годзе даў незвычайныя вынікі: з 52 экзаменаваўшыхся двое атрымалі нездавальняючыя адзнакі, двое здалі на «здавальняюча» і 17 чалавек атрымалі адзнаку «выдатна». Сярод апошніх многія выявілі вельмі добрыя веды (Карабанава, Арабіна, Власава), але ўсё-ж трэба сказаць, што ў гэтым годзе ні адзін са студэнтаў не здаў экзамен, так сказаць, бліскуча, як гэта здаралася ў мінулыя гады. Некаторыя адказвалі яўна ніжэй сваіх магчымасцей (Гаеўская, Гетко).

Такі вынік экзамену прымушае задумацца. Кафедра, безумоўна, зробіць патрэбныя вывады і зверне большую ўвагу на практычныя заняткі, якія з'яўляюцца лепшым метадам кантролю за работай студэнта на працягу года.

Але ёсць, відавочна, і больш агульныя прычыны. Несумненна, што на факультэт была прынята вядомая колькасць людзей, не маючых ні дастатковай падрыхтоўкі, ні прызвання да біялогіі. Значыць, у практыцы работы прыёмных камісій ёсць яшчэ вядомыя заганы, якія павінны быць ліквідаваны. У прыватнасці, я лічу зусім няправільным, што пры паступленні на біяфак не трэба здаваць экзамен па матэматыцы. У выніку многія ідуць на біяфак толькі таму, што яны дрэнна паспявалі па матэматыцы ў школе. Цяпер, калі на I курсе біяфака ўстаноўлен курс вышэйшай матэматыкі, такое становішча асабліва нецярпіма, тым больш, што з кожным годам матэматыка, фізіка і хімія набываюць усё большае значэнне ў біялогіі.

Акрамя гэтага, зусім няправільна, што пры паступленні на біяфак няма экзамену па спецыяльнасці, які павінен мець вялікае значэнне. Мне здаецца, што са мной згодзяцца усе выкладчыкі біялагічнага факультэта і падтрымаюць ініцыятыву БДУ, калі гэтыя важныя пытанні будуць пастаўлены перад Міністэрствам вышэйшай асветы.

Прафесар Г. Г. ВІНБЕРГ.

## Выпрабаванне волі пачынаецца з малога

Там, за акном—заліты сонцам скверык.

Лёгкі ветрык калыша абсыпаныя цветам галінкі; пялёсткі, быццам матылькі, кружацца, падаюць у маладую траву. Тут, у чытальнай зале, гарыць электрычнае святло.

Анна Аронаўна Эвенчык ціха перашэптваецца са студэнтамі, выдаючы ім кнігі, ды хтосьці ў пярэднім радзе час-ад-часу шалясціць газетай.

— Выйдзем, хлопцы, ці што?—студэнт першага курса аддзялення фізікі Іван Манак закрыў кнігу і запытальна пагледзеў на аднакурснікаў Уладзіміра Рубанава і Лёву Камарова.

— Ды мы-ж нядаўна адпачывалі, Іван. Ну і непаседа ты аднак,—засмяяўся Уладзімір і, узяўшы сябра за плячо, рашуча дадаў:—Сядзі.

Праца працягвалася.

«Пайдзі ў скверык, дык наўрад ці вернешся да работы і праз поўгадзіны»,—падумаў Уладзімір, бо добра ведаў, як хораша пасядзець, ну хаця-б пяць мінут, на лаўцы, што надзейна схавалася ад сонца пад шумлівай, густой ліствой, а там яшчэ і дзяўчаты ў беласнежных халатах выйдуць з медінстытута.

— Папрацуем яшчэ з гадзіну, тады і адпачнем, праўда?—шапнуў ён Лёву і раскрыў зборнік задач па матэматыцы: заўтра, акрамя тэорыі, патрэбна ведаць і рашэнне прыкладаў.

Прайшла гадзіна.

Студэнты збіраліся падняцца, як да іх стала падышоў аднакурснік Васіль Гніламёдаў.

— Слухайце, хлопцы, дапамажыце разабрацца ў інтэгрыраваным вылічэнні,—звярнуўся да іх Васіль.

Лёва «пазычыў» ад суседняга стала крэсла, папрасіў Васіля сесці—і пачалося карпатлівае цярплівае тлумачэнне.

— Дзякую, вы—сапраўдныя таварышы, — сказаў, нарэшце, Васіль і радасны пайшоў да свайго стала.

Лёва, Уладзімір і Іван вышлі ў скверык.

Не спяшаючыся, яны некалькі разоў абышлі яго. Іван хацеў яшчэ прылегчы на траву, але Уладзімір, паглядзеўшы на гадзіннік, сказаў:

— Пара.

— Так хутка?—паспрабаваў пярэчыць Іван.

— Вось яшчэ «хутка»: прайшло ўжо пятнаццаць мінут,—адказаў за Уладзіміра Лёва і працягваў, калі яны ўтрох зноў ішлі да біякорпуса:—Цяпер, брат, галоўнае трымаць сябе ў руках. Папусцішся, махнеш на ўсё рукой—і праваліўся, як кажуць. І мне здаецца, што вось тут, у чытальнай зале, кабінетах і аўдыторыях, мы выпрацоўваем у гэты дні сваю вытрымку, сваю волю. Так я гавару?—павярнуўся Лёва да Івана.

— У прынцыпе так, — павёў Іван рукой па валасах.

— Ды не ў прынцыпе, а ў сапраўднасці так,—паправіў яго Уладзімір, і студэнты пашлі ў чытальную залу, дзе зноў паўтаралі тэорыю вышэйшай матэматыкі, замацоўвалі яе рашэннем прыкладаў.

А на другі дзень кандыдат фізіка-матэматычных навук Арон Міхайлавіч Родаў прымаў у першакурснікаў залік па матэматыцы.

Слухаў Арон Міхайлавіч адказы студэнтаў і ад душы радаваўся: выдатна адказвалі не толькі Уладзімір Рубанаў, Лёва Камароў, Іван Манак, але амаль усе першакурснікі аддзялення фізікі.

Ды не толькі змястоўныя адказы радавалі Арона Міхайлавіча. Выкладчык бачыў, што глыбокае веданне матэматыкі першакурснікамі—вынік іх настойлівасці, любві да працы, імкнення да канца разабрацца ў кожным пытанні.

«А з гэтымі якасцямі характару,—думаў Арон Міхайлавіч,—будучыя фізікі смела пераадолеюць усе цяжкасці».

В. ПАЎЛОВІЧ.

## Экскурсіі студэнтаў на прадпрыемствы

XX з'езд КПСС удзяліў вялікую ўвагу пытанню сувязі работы школ і ВНУ з прадпрыемствамі.

Кафедры палітэканоміі зрабіла многа ў гэтых адносінах. Толькі за гэты год на прадпрыемствах горада Мінска пабывала каля 400 студэнтаў філалагічнага факультэта. Былі праведзены экскурсіі на такія буйнейшыя прадпрыемствы, як трактарны і аўтамабільны заводы, тонкасуконны камбінат, лікёра-водачны завод, друкарня імя Сталіна. Яны пазнаёмілі студэнтаў з важнейшымі працэсамі вытворчасці.

На трактарным заводзе, напрыклад, студэнты пабывалі ва ўсіх цэхах і бачылі, як вырабляюцца самыя складаныя часткі магутных тралёвачных трактараў і трактара «Беларусь».

Ф. СЯЛЯЎКА,
студэнтка III курса філалагічнага факультэта.

## Лекцыя аб праблемах генезісу

Лекцыя аб праблемах сучаснай генетыкі, якую днямі прачытаў для аспірантаў універсітэта доктар біялагічных навук Н. В. Турбін, прадстаўляла значную цікавасць і прыцягнула вялікую колькасць слухачоў.

Праф. Н. В. Турбін падрабязна расказаў аб поспехах, якія дасягнуты савецкімі і зарубежнымі вучонымі ў вырашэнні праблем спадчыннасці, аб практычных выніках іх укаранення ў сельскую гаспадарку і медыцыну.

К. ПАЎЛАЎ.

# ПАВЫШАЦЬ ЯКАСЦЬ ПІСЬМОВЫХ РАБОТ

З году у год на філфаку лепшыя курсавыя, гуртковыя і семінарскія работы перарастаюць у дыпломныя, лепшыя з іх адзначаюцца гарадскімі аглядамі і некаторыя загадам міністра.

Факультэт па праву ганарыцца работамі студэнтаў-выпускнікоў Н. Гілевіча, Н. Бязрукавай, А. Мальдзіса, І. Котава, В. Несцяровіча, Е. Гарбатоўскай, М. Арочкі, А. Чаркасава. К. Каратая, Г. Сталярова. Змястоўныя і цікавыя работы напісалі студэнты малодшых курсаў—Р. Нікіфаровіч, С. Андрэюк, Н. Прашковіч, І. Пісарэнка, С. Клеменценка, Б. Сачанка, І. Смыкава, М. Ваўчок, Е. Недасекіна.

Аднак усё гэта не можа засланіць таго, што цэлы рад курсавых, семінарскіх і дыпломных работ выконваецца з вялікім спазненнем, а нярэдка не толькі не адпавядае усё узрастаючым патрабаванням падрыхтоўкі філолагаў і журналістаў з універсітэцкай асветай, а проста у сілу сваёй малапісьменнасці і недапушчальнай блізкасці да неназваных крыніц наогул не можа быць залічаны да курсавых, семінарскіх, а тым больш дыпломных работ.

На партыйным сходзе філалагічнага факультэта, які абмяркоўваў папярэднія вынікі семестра і задачы веснавой экзаменацыйнай сесіі, выступаўшыя у спрэчках тт. Акулаў і Булацкі красамоўна выказалі і сваю незадаволенасць ліберальнасцю ацэнак дыпломных работ і у сваіх спрэчках паказалі, што многія работы захвалены. Пасля доўгіх словаспрэчак работы Ярмашэвіча і Каршукова атрымалі добрыя ацэнкі і толькі Нікіфарава і Мірачыцкага—здавальняючыя (V курс аддз. журналістыкі).

Ці толькі-ж на кафедры друку падобны малюнак? Нажаль, далёка не так. Пры абароне дыпломных работ на кефдрах кіраўнікі і рэцэнзенты адзначаюць істотныя недахопы, называюць дзесяткі памылак, абвінавачваюць выпускнікоў у малапісьменнасці, але хістаюцца толькі у адным—ставіць «добра» ці «выдатна». Такія выступленні па розных работах І. Л. Парашковай, Н. І. Лапідуса, Г. В. Булацкага, Е. Л. Бондаравай, М. С. Зярніцкага.

Ліберальнасць пры абароне дыпломных работ прыносіць двайную шкоду: яна падрывае аўтарытэт ацэнкам работ выпускніка і размагнічвае студэнтаў малодшых курсаў. Азнаямленне з часткай кантрольных і курсавых работ студэнтаў завочнага факультэта паказвае, што тут вельмі і вельмі многія пішуць зусім не на тэму. Напрыклад, студэнты Д. С. Капітан, Л. С. Альтшулер, Н. Р. Фаневіч, Н. В. Банасевіч, В. І. Гаркач, Л. Е. Маханёк, І. І. Папкоўскі, Д. А. Паўлоўская, В. Н. Ласкутнікаў, Г. П. Лазавік, П. Я. Емельянаў, Г. Н. Вераценнікаў, Н е б о с ь к а і на II і на IV курсах «запазычваюць» старонку за старонкай з падручнікаў і крытычных работ, не задаюцца мэтай крытычна асвоіць патрэбную літаратуру, самастойна прадумаць план работы або яе аргументацыю. Трэба не толькі рашуча пакончыць з лібералізмам і павысіць патрабавальнасць да пісьмовых работ, але па прыкладу кафедр гістарычнага факультэта (заг. кафедрамі Л. С. Абецэдарскі і Л. М. Шнеерсон) дэталёва прадумваць і ажыццяўляць планамерныя, сістэматычныя кансультацыі і метадычную дапамогу пры напісанні курсавых, семінарскіх і, асабліва, дыпломных работ. Чаму-б, напрыклад, не даручыць аспірантам дадаткова весці кансультацыю па асобных работах? Зусім натуральна, што заг. кабінетамі, метадысты завочнага факультэта і лабаранты павінны аказваць сур'ёзную сістэматычную дапамогу у складанні бібліяграфіі, у належным афармленні усіх пісьмовых работ. Між тым, гэты участак работы выпадае з поля зроку кафедр. Толькі на кафедры рускай мовы вітрына паказвае, як афармляць пісьмовыя работы.

Але калі мы спытаем, колькі студэнтаў стацыянара, а тым больш завочнікаў, атрымалі кансультацыю у кабінетах рускай і зарубежнай літаратуры, беларускай мовы і літаратуры, кабінеце друку, то нічога станоўчага не даведаемся. Ці мог кабінет друку сур'ёзна кансультаваць студэнтаў, калі сама кафедра, як адзначаецца у рэзалюцыі партыйнага сходу, з такім вялікім спазненнем дала тэмы курсавых работ, што многія студэнты не змаглі напісаць іх да сесіі? Вядома, не мог. Кафедры павінны, выконваючы указанні рэктарата, своечасова даводзіць тэматыку дыпломных работ да студэнтаў, сістэматычна накіроўваць іх работу, даваць кансультацыі у кабінетах сіламі малодшага звяна навуковых работнікаў, лабарантаў. Трэба арганізаваць стэнды-выстаўкі, на якіх дэманстраваліся-б лепшыя курсавыя, семінарскія і дыпломныя работы.

# НАШЫ АБАВЯЗКІ

Падводзячы вынікі работы у сетцы партыйнай асветы ва універсітэце за прайшоўшы навучальны год, трэба адзначыць, што заняткі на усіх філасофскіх і эканамічных семінарах, у гуртках бягучай палітыкі праходзілі на высокім узроўні.

З вялікай цікавасцю, сістэматычна і глыбока вывучаліся выкладчыкамі і адміністрацыйна-гаспадарчнымі раоотнікамі універсітэта матэрыялы XX з'езду КПСС. Гэтаму у значнай ступені садзейнічаў кантроль з боку грамадскіх арганізацый. Так, на пасяджэнні мясцкома БДУ двойчы слухалася пытанне аб вучобе членаў профсаюза у гуртках і семінарах сеткі партыйнай асветы, правяралася рэгулярнасць заняткаў гурткоў, наведванне заняткаў членамі профсаюза. Многа увагі гэтаму пытанню удзялялі факультэцкія грамадскія арганізацыі. Усё гэта спрыяльна адбілася на паляпшэнні работы гурткоў і семінараў. Добра была пастаўлена работа у сетцы партыйнай асветы геолага-геаграфічнага, біялагічнага, хімічнага факультэтаў.

Добра працавалі семінары, якімі кіравалі тт. Сцяпанаў, Грышановіч. Заняткі на гэтых семінарах праходзілі рэгулярна, слухачы добрасумленна да іх рыхтаваліся, актыўна удзельнічалі у абмеркаванні пытанняў. Добра таксама праходзілі заняткі у гуртках, якімі кіравалі тт. Лазавая, Іваноўская, Анісімава.

Аднак былі і недахопы. Гэта перш за ўсё дрэннае наведванне філасофскага семінара на філфаку. Дрэнна наведвалі заняткі тт. Ларчанка, Зазека, Булацкі, Жыркевіч, а грамадскія арганізацыі, па сутнасці, прайшлі міма гэтых фактаў.

Навучальны год у сетцы партыйнай асветы канчаецца. Наш абавязак—правесці апошнія заняткі на высокім узроўні.

**А. РАКАЎ.**

# ШТО ПАТРЭБНА СТУДЭНТАМ-ФІЗІКАМ

Да сучаснага моманту работа па політэхнізацыі навучання студэнтаў-фізікаў у нас, ва універсіце, не вядзецца на належным узроўні. За 5 год вучобы у БДУ мы не маем магчымасці пазнаёміцца са станкамі, са слясарна-такарнай справай. Механічная майстэрня, якая маецца на фізіка-матэматычным факультэце, не ў стане ахапіць нават невялікай часткі студэнтаў. Экскурсіі на заводы праводзяцца рэдка, ды і 2 — 3-гадзіннай экскурсіі недастаткова нават для азнаямлення з працэсамі вытворчасці.

Каб выправіць гэтыя недахопы, каб падрыхтоўка студэнтаў, скончыўшых фізмат, адпавядала патрабаванням політэхнічнага навучання у школе, мы лічым, што неабходна праводзіць 3—4-дзённыя экскурсіі на заводы, у МТС рэспублікі, арганізаваць вялікую механічную майстэрню, забяспечаную неабходным абсталяваннем, стварыць радыёгурток, для якога трэба набыць радыёдэталі, прыборы для радыёвымярэнняў, паяльнікі, ручныя ціскі і іншыя неабходныя інструменты і матэрыялы.

Звяртаючыся праз газету «Беларускі універсітэт» у рэктарат і партарганізацыю БДУ, мы просім задаволіць нашы мінімальныя патрабаванні.

**Група студэнтаў фізіка-матэматычнага факультэта.**

*На конкурс* ФЕЛЬЕТОН

# СТРАКАЗА

Увесь адвячорак Ніна Коньшава не магла супакоіцца.

«Няўжо ён і сёння не прыдзе,— у роспачы думала яна.—Проста незразумела. У парк толькі пакажыся, дык ад хлопцаў не адчапіцца. Хоць у чаргу іх пастрой. Але што мне да іх. А ён...»

Дзяўчына цяжка уздыхнула, падышла да акна і, абапёршыся на руку, заспявала:

Он живет, не знает
Ничего о том,
Что одна девчина
Думает о нем...

Не! Вам не уявіць сабе, што гэта была за мелодыя! Гора, смутак, адчай зліліся у адно цэлае. Здавалася, гэта спявала само сэрца—сэрца... разбітае няшчасным каханнем. І толькі той, хто не адчуў гэтага пачуцця, можа не паспачуваць небарацы.

А дзяўчына усё яшчэ стаяла ля акна. Лёгкі шараваты змрок даўно ужо апусціўся на зямлю. На вуліцах запальваліся агні, паволі прахаджваліся пары.

«Шчаслівчыкі,—падумала Ніна.—А я, эх...—Дзяўчына усхліпнула і закрыла твар рукамі.—А тут яшчэ экзамены. Адзін дзень застаўся. Усе рыхтуюцца, а мне хоць галаву у пятлю».

Ніна прысела на ложак і доўга сядзела моўчкі. Нарэшце твар яе асвятліла усмешка. Дзяўчына устала і пачала разважаць: «Экзамен — сур'ёзная справа. Але-ж хіба ён важней кахання? Каханне—гэта таксама экзамен. Экзамен на усё жыццё. А па тэорыі друку выкручуся. Выкруцілася-ж на заліках. Лепш падумаць аб іншым».

У ход пайшлі люстэрка, грэбень, прыколкі.

«Не разумею. І дзяўчына-ж я, здаецца, прыгожая. Хіба Галя або Клара ужо такія кветкі. А нябось, ужо даўно, як галубкі, парамі ходзяць. А што, калі што-небудзь прыдумаць?»

І дзяўчына, углядаючыся у люстэрка, пачала думаць.

«Так, бровы, здаецца, добрыя. Вочы... губкі... прычоска... прычоска...»

Пры апошнім слове Ніна падняла вочы угору, штосьці прыкідваючы у думках.

— Ідэя,—радасна ўсклікнула яна,—іменна прычоску патрэбна змяніць. І тады...—дзяўчына ад радасці успляснула рукамі.—Толькі прычоска павінна быць моднай. Але якой? Можа такой, як у яго? Правільна! Тады я буду выглядаць... Эх, і слаўна-ж прыдумана! Так і зраблю. Сёння не пайду на танцы. Няхай ён мяне не бачыць. А заўтра з'яўлюся туды каралевай.

Спала Ніна моцна. На яе твары блукала шчаслівая усмешка. Сніліся ёй новая прычоска, і кавалер, і экзаменатар, якога яна абвяла вакол пальца. Радасны сон! Але гэта быў толькі сон. Прычоску яна і сапраўды зрабіла модную і здзівіла усіх. Ды толькі не так, як думала. А што датычыцца экзамену, дык ёй зусім не пашанцавала.

І патрэбна-ж здарыцца такому! Гаварыла Ніна вельмі многа. Спачатку адказвала на пытанні білета, а потым пачала гаварыць усё, што ведала па гэтаму курсу. Зрэдку яна пaглядала на экзаменатара. Той ледзь бачна усміхаўся і зрэдку паціскаў плячмі. Ніне здавалася, што ён вельмі задаволены яе адказам, і дзяўчына гаварыла яшчэ больш.

— А вы ведаеце артыкул Леніна «Партыйная арганізацыйная і партыйная літаратура»?

— Вядома, ведаю. Гэта-ж выдатны твор Уладзіміра Ільіча.

— А калі напісан артыкул?

І не паспела Ніна падумаць, як лепш «крутнуцца» на гэты раз, як у яе зноў запыталі:

— Ну, як вы думаеце, да рэвалюцыі або пасля?

— Вядома, пасля,—выпаліла Ніна,—гэтага-ж сорам не ведаць.

Вось выкладчык ставіць адзнаку. Ніна пакуль не ведае якую, але, задаволеная «удачай», шчасліва усміхаецца. Узяўшы заліковую кніжку, яна нахмурылася, твар яе скрывіўся, рукі задрыжэлі.

— Тройка... Дык як-жа гэта? І стыпендыя... Не магу-ж я без стыпендыі... Не магу...

Яна яшчэ і цяпер не страціла надзеі выкруціцца як-небудзь. Але як яна ні круцілася, а са стыпендыяй прыйшлося развітацца. «Плавала» яна і на экзамене па беларускай літаратуры.

Гуляе Ніначка. Моды выдумляе, вырашае, як лепш запусціць стралу Амура у якое-небудзь юначае сэрца. Забылася яна і аб стыпендыі. Магчыма, дзяўчыне цяпер і не шкада яе. Затое нам вельмі шкада. І шкада не яе стыпендыі, а таго, што такія вось Ніны засмечваюць наш калектыў.

**Э. ГАРЧЫЦА.**

Роберт **БЕРНС**

## МАЕ СЭРЦА У ГАРАХ

*Не тут—у гарах назаўжды маё сэрца:*
*Па кручах за дзікім аленем імкнецца,*
*Пільнуе казулю і клікае рэха,*
*Яно—у гарах дзе-б не йшоў я, ні ехаў.*
*Шатландыя, мілая поўнач, бывай,—*
*Радзіма бясстрашша і мужнасці край*
*О горы, паўсюль—у пустынях, марах*
*Мне кожны ваш выступ стаяў у вачах.*
*Бывайце, вяршыні у шапках снягоў,*
*Бывайце, даліны, кілімы лугоў,*
*Бывайце, лясы і над безданню дрэвы,*
*Бывайце, патокі з чароўным напевам.*
*Не тут—у гарах назаўжды маё сэрца:*
*Па кручах за дзікім аленем імкнецца,*
*Пільнуе казулю і клікае рэха,*
*Яно—у гарах дзе-б ні йшоў, я, ні ехаў.*

**Пераклад з англійскай мовы Рыгора БАРАДУЛІНА.**

# Пачатак нядрэнны

Федзя Чумакоў і Лёня Акуленка ніяк не маглі згадзіцца з тым, што першымі будуць здаваць экзамен не яны. Гэтага патрабавалі аднакурснікі. «І як яны заўсёды паспяваюць прыйсці першымі?— думаў Федзя.—Што-ж, нічога не зробіш: прыдзецца крыху пачакаць». Хлопцы вышлі з корпуса фізмата і накіраваліся у скверык.

І толькі гадзіны праз тры Федзя зайшоў у аудыторыю з заліковай кніжкай і чыстым лістом паперы у руцэ. Адказ яго быў змястоўным. Ён добра пераклаў незнаёмы тэкст, дэталёва зрабіў разбор сказа, паказаў добрае веданне граматыкі. Выкладчык нямецкай мовы Л. А. Цыганкова паставіла у яго заліковую кніжку выдатную адзнаку.

Як толькі Федзя вышаў з аудыторыі, сябры павіншавалі яго з добрым пачаткам.

Добра адказаў на усе пытанні і Лёня Акуленка. «На першым курсе,—расказвае Людміла Аляксееўна,—ён займаўся значна слабей другіх. А цяпер яго не пазнаць. І наогул да гэтай групы у мяне няма ніякіх прэтэнзій. Я працую тут два гады, і студэнты заўсёды акуратна выконвалі дамашнія заданні, не прапускалі лекцый. Асабліва хочацца адзначыць Соню Гальдштэйн, Нэлу Майсеенка, Федзю Чумакова і Лёню Акуленка».

Сапраўды, другакурснікі аддз. матэматыкі зрабілі добры пачатак. Экзамен здавала 15 чалавек, з іх 8 атрымалі выдатныя адзнакі, астатнія—добрыя.

**В. СКАПА.**

## Апавяданне ў малюнках



# БОЛЬШ УВАГІ ПЫТАННЯМ ПАРТЫЙНАГА ЖЫЦЦЯ

Факультэцкая газета з'яуляецца органам партыйнай і грамадскіх арганізацый. Гэта абавязвае рэдкалегію працаваць так, каб зрабіць газету баявой трыбунай, з якой-бы гаварылі комуністы, комсамольцы і радавыя студэнты аб становішчы спрау на факультэце, смела ускрывалі недахопы, расказвалі аб сваім удзеле у барацьбе за высокую паспяховасць і дысцыпліну студэнцкага калектыву.

Добра разумеючы гэту задачу, рэдкалегія насценгазеты «Советский юрист» імкнецца пауней адлюстроуваць студэнцкае жыццё, і у прыватнасці партыйнае жыццё. У тэматычным плане газеты, які мы складаем на семестр, аддзел партыйнага жыцця займае вядучае месца.

Пытанні, якія плануюцца рэдкалегіяй, узгадняем з партыйным бюро, дагаварваемся з аутарамі аб тэрмінах прадастаулення жадаемых матэрыялау. Словам, не чакаем, пакуль заметкі самі прыдуць да нас, а арганізоуваем іх.

За прайшоушы час бягучага навучальнага года у «Советском юристе» выступілі з артыкуламі сакратар партбюро т. Матусевіч, член партыйнага бюро т. Садоускі, студэнты-комуністы Каблянау, Гарох і іншыя. Артыкул т. Матусевіча быу прысвечан значэнню партыйных даручэнняу у выхаванні маладых комуністау. На канкрэтных прыкладах аутар артыкула паказау, як важна для маладога комуніста сур'ёзна адносіцца да выканання кожнага партыйнага даручэння, падверг крытыцы тых, хто пасіунічае, пазбягае грамадскай работы.

Прынцыповым быу артыкул т. Садоускага «Аб абавязку комуніста». Ён правільна адзначыу, што абавязкам кожнага комуніста з'яуляецца выдатная вучоба і прыкладныя паводзіны. Аутар тут-жа называе комуністау, якія паспяваюць па усіх прадметах на «выдатна» і «добра» і аказваюць дапамогу у вучобе таварышам. Але артыкул не заканчваецца на гэтым. У ім падвяргаюцца справядлівай крытыцы тыя, што сваімі паводзінамі ганьбяць высокае званне члена партыі. Аутар асабліва асуджае паводзіны студэнта-комуніста Крукава, які дазваляе сабе з'яуляцца у грамадскіх месцах у п'яным стане, наладжвае скандалы Далей у артыкуле крытыкуюцца комуністы, якія паспяваюць у вучобе, але не унікаюць у становішча спрау вучэбных груп, беспрынцыпова вядуць сябе у адносінах да гультаёу і парушальнікау дысцыпліны.

Падводзячы вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі, рэдкалегія змясціла у газеце артыкул «Комуністы-студэнты павінны быць прыкладам у вучобе». У ім падымалася пытанне аб ролі партыйных груп курсау у барацьбе за выдатную паспяховасць студэнтау.

Аглядаючыся назад, на прароблeную работу па асвятленню у газеце пытанняу партыйнага жыцця, нам прыемна усведамляць, што змешчаныя намі артыкулы не павіслі у паветры, яны прынеслі пэуныя вынікі па паляпшэнню паспяховасці і умацаванню дысцыпліны на факультэце. Так, за недастойныя паводзіны комуніст Крукау на партыйным бюро папярэджаны. Узнятае газетай пытанне аб павышэнні актыунасці работы партыйных груп курсау было абмеркавана на партыйным сходзе факультэта. Гэта прынесла свае вынікі. Цяпер актыунасць партыйных груп курсау прыкметна павысілася.

Рэдкалегія добра разумее, что у асвятленні партыйнага жыцця у нашай насценнай газеце зроблены толькі першыя крокі. У нас ёсць рад недахопау, але мы іх выправім, каб зрабіць газету «Советский юрист» баявой партыйнай трыбунай.

Мне здаецца, што і на іншых факультэтах трэба завесці аддзелы партыйнага і комсамольскага жыцця.

**В. ВОСТРЫКАУ.**
**рэдактар насценнай газеты «Советский юрист».**

# НІЖЭЙ СВАІХ МАГЧЫМАСЦЕЙ

На II курсе аддз. журналістыкі апошні экзамен. Студэнты радасныя і усхваляваныя: уперадзе першая практыка і адпачынак. І нікому не прыходзіць у галаву, што радасць гэта не зусім заслужаная, хаця на першы погляд вынікі сесіі нядрэнныя. Але гэта толькі на першы погляд. «Дасягненні» курса бачны ужо з таго, што колькасць выдатнікау паменшылася у тры разы. Асноуная маса студэнтау здала экзамены на «добра», але у некаторых за гэтымі добрымі адзнакамі хаваюцца працяглыя пошукі «аб'ектыуных» прычын, каб атрымаць дазвол дэканата на пераздачу дрэнных і здавальняючых адзнак.

Адносіны да сваёй будучай прафесіі студэнты-журналісты наглядна прадэманстравалі на асноуным прадмеце курса—тэорыі і практыкі партыйнага і совецкага друку. Напярэдадні экзамену па гэтаму прадмету большая частка студэнтау мела запазычанасць па практычных работах і павінна была ліквідаваць яе. Г. Клябанаву, Т. Булгаковай і А. Станюце давялося рабіць макеты газет на экзамене. І няма чаго здзіуляцца, што чатыры чалавекі атрымалі здавальняючыя адзнакі.

Дрэнна рыхтаваліся студэнты не толькі да гэтага экзамену. У калідорах універсітэта часта можна было убачыць усхваляваных і разгубленых студэнтау, якія, атрымаушы дрэнную ацэнку, многа гаварылі аб неаб'ектыунасці выкладчыка, зусім забыушы пры гэтым, што самі яны нічога не рабілі. У некаторых падрыхтоука да экзамену пачыналася пасля варажбы: здам або не здам.

Але усіх гультаёу перакрочыу Г. Клябанау. Перш чым атрымаць экзаменацыйны білет, ён павінен быу ліквідаваць запазычанасці. Так здарылася на экзамене па тэорыі і практыцы партыйнага і совецкага друку, а потым зноу паутарылася на экзамене па англійскай мове. Але гэта яшчэ не усё: Г. Клябанау так і не здау курсавой работы па практычнай стылістыцы.

Значна ніжэй сваіх магчымасцей здалі летнюю экзаменацыйную сесію П. Беражкоу, І. Шамрэева, Г. Бураукін. В. Зуёнак і іншыя.

Вынікі сесіі будуць абмяркоувацца на комсамольскіх сходах. Зноу будуць крытыкаваць адстаючых, аб якіх, нажаль, успамінаюць толькі пасля экзаменацыйнай сесіі.

**Т. ДМІТРЫЕВА,**
**С. НІКАЛАЕУ.**

## ПА СТАРОНКАХ ГАЗЕТ ВНУ

### Каштоуная знаходка

Працуючы у архівах рукапіснага фонда Рускага геаграфічнага таварыства, дацэнт кафедры рускай літаратуры Л. С. Шэптаеу знайшоу звыш 60 неапублікаваных сюжэтау і варыянтау народных песень. Яны занісаны каля ста год назад географамі-вышукальнікамі.

Песні прысвечаны сялянскаму руху XVII ст., многія з іх апяваюць подзвігі паустанцау пад кіраупіцтвам Сцяпана Разіна. Найвялікшую цікавасць для фалькларыстыкі прадстауляюць сюжэты аб Астраханскім паходзе Разіна.

**(«Советский учитель», орган Ленінградскага педінстытута імя А. І. ГЕРЦЭНА).**

### Паездка у Фінляндыю

Днямі у Фінляндыю у госці да студэнтау Настауніцкай семінарыі г. Раума выязджае група студэнтау нашага інстытута. Дэлегацыю узначальвае выкладчык кафедры філасофіі Б. А. Еруноу.

У складзе дэлегацыі—студэнты Н. Дорахава (педагагічны факультэт), Н. Егорава (гістарычны факультэт), Т. Куцэнка (факультэт прыродазнауства), Г. Лізунова і Л. Мельнікава (факультэт замежных моу), І. Паламошнау (факультэт народау Крайняй Поуначы), В. Сласціхіна (дэфекталагічны факультэт), Т. Фурсава (гістарычны факультэт).

**(«Советский учитель»).**

# Універсітэцкі ВОЖЫК



## „Великий изобретатель"

Студент II курса отд. журналистики Г. Кузьмиченко изобрел оригинальную шпаргалку.



*Нет ничего*
*удобней*
*и краше,*
*Чем шпаргалка-*
*карандашик.*
*На производство*
*выдан*
*патент*
*Г. Кузьмиченко*
*(наш студент,*
*Его, конечно, знают все—*
*конферансье).*

## К печальной истории отношений

К. Георгиева (студента IV курса отд. журналистики) к «Истории международных отношений».



*ПОЛИТИКА С ПОЗИЦИИ НЕВЕЖЕСТВА.*

## ЧУДО-ЛЕКТОР

А. Устинович, студ. IV к. филфака, за год «работы» в лекторской группе БГУ не прочел ни одной лекции.



*Этот лектор бестолковый*
*За год не сказал ни слова.*
*Чудо-лектором с замочком*
*Не написано ни строчки.*

## „Выдающаяся" личность

Ф. Кучар—студент III курса отд. геологии.



*Какой миляга*
*Кучар-стиляга!*
*Он водки, пива*
*Большой любитель,*
*И вытрезвитель—*
*Его обитель.*

ФЕЛЬЕТОН

# ПЛЯМА

За невялікім столікам сядзіць юнак і смакуе боршч. Такі апетыт і так хочацца есці, што язык можна праглынуць. Лыжка пачынае ужо слізгацца па дне талеркі. І тут табе... Чамусьці уздрыгнула рука, перакулілася лыжка—і тлустая вадкасць паплыла на крысо пінжака.

— Чорт вазьмі, цяпер людзям на вочы не пакажашся,—выгукнуу наведвальнік і злосна залыпау вачамі.

Побач паміpау ад смеху яго таварыш—студэнт Асіпенка.

— Авадзень укусіу цябе ці што?

— Паглядзі толькі, якая вялікая пляма,—плаксіва прабасіу той і скрывіуся, быццам-бы праглынуушы лыжку гарчыцы. Адразу можна было зауважыць, што на гэты раз Карбезаву проста не пашанцавала.

— Ды не хныкай ты: на лекцыі-ж усёроуна не пойдзеш.

— Ліха з імі, гэтымі лекцыямі. Было-б па чым бедаваць. Пасля майскіх святкоу я ужо дзесяць дзён не паказвау свайго носу туды.

— І правільна робіш. У мяне хоць пару хвосцікау пасля зімняй сесіі і засталося, ды я не апускаю вушы. Мне-ж, урэшце, не веды, а дыплом патрэбен.

Некаторы час за столікам панавала амаль што сапрау́дная цішыня. Толькі зрэдку паскрыпвалі крэслы і гулка звінелі відэльцы. Цішыня, кажуць, некаторым асобам садзейнічае нараджэнню усялякіх думак. Штосьці падобнае сталася і на гэты раз. У Карбезава нарадзілася ідэя. Не проста ідэйка, а самая што ні ёсць ідэя, ад якой ён быу гатовы рассмяяцца.

— Калі-б я быу крыху большай шышкай, абавязкова увёу-бы на юрфаку поуную свабоду для студэнтау: хочаш,—бяры пад руку прадмет свайго кахання і гуляй сабе; хочаш—бяры канспект і смалі на лекцыю. Здорава зажылі-б мы з табою тады. Прауда?

Асіпенка сустрэу такую ідэю у абдымкі. Ад прыліву прыемных пачуццяу у яго нават задрыжау падбародак.

— Маладзец-жа ты, Толік, далібог! Які смелы у цябе палёт думак. Лішні раз пераконваюся, што дарэмна гэта цябе так размалёувалі у насценгазеце і па усіх склонах скланялі на комсамольскіх сходах. Хіба-ж яны могуць заглянуць у сваё сэрца? Дзе там!

Карбезау яшчэ больш падбадзёрвауся.

— Падумаць толькі! Называць мяне амаль не абломауцам. У апошні раз на сходзе нагаварылі такога, што аж у галаве не змяшчаецца. Моу, я на шыі у бацькоу сяджу, не займаюся нічым грамадска-карысным. Скажы, а якая ім справа да мяне? Я-ж у іх міску са сваёй лыжкай не лезу. Эх, хутчэй-бы закончыць універсітэт.

— Ды плюй ты на усё і беражы здароуе. Калі будзеш успрыймаць усялякія заувагі, дык хутка сапсуеш нервы. А на тое, што трэцякурснікі так хвалююцца за наша будучае, не звяртай асаблівай увагі. Пакрычаць і змоукнуць. Што-ж, мабыць, пойдзем.

Вышлі на вуліцу. Пасля дажджу лёгка дыхалася. Сонца прыпякала па-веснавому.

— Ты на усякі выпадак заглянi у аудыторыю. А я пабягу. Будзь здароу.

—Ні пуху табе,—хітра падмаргнуу Карбезау і накіравауся у бліжэйшы сквер. Ісці было цяжка. Паглядзеу на гадзіннік. Толькі што пачалася лекцыя. У галаве мроіліся розныя думкі. І чаму-ж яму не вязе у жыцці? Вучыуся у інстытуце народнай гаспадаркі—крытыкавалі. Тады яму здалося, што памыліуся у выбары прафесіі. Вырашыу стаць юрыстам: гаварылі, што на юрфаку лягчэй вучыцца. Але і тут праз некаторы час спаткала яго пауне́йшае расчараванне. У заліковай кніжцы адна за другой з'явіліся тройкі. Пачалі крытыкаваць, упікаць за пропускі лекцый. Але чаму?

— Анатоль?—нечакана адарвау яго ад думак чыйсьці голас.—Дзе ты такую пляму пасадзіу на свой касцюм? Трэба-ж было пачысціць, а то няёмка крыху.

— Ах, зусім забыу!—усклікнуу Карбезау, успомніушы пра здарэнне у сталовай. Паглядзеу на пінжак, на якім красавалася вялізная чорная пляма. Яна вельмі моцна псавала яго вонкавы выгляд.

«Як непрыемна глядзець, калі на чыстай вопратцы пяуляецца пляма»,—падумау Карбезау.

Пляма! Яшчэ горш, калі яна выступае на паверхню нашага жыцця.

**В. ЧАРЭШНЯ.**

# ДА ВЫНІКАЎ АГЛЯДУ НАСЦЕННЫХ ГАЗЕТ

У БДУ выходзіць каля 30 насценных газет. За прайшоўшы перыяд 1955/56 навучальнага года роля насценнага друку на факультэтах значна узрасла. Палепшылася якасць нумароу, стала больш рознастайнай тэматыка змешчаных матэрыялау, некалькі узмацнілася дзейнасць выступленняу газет.

Па прыкладу работы рэдкалегіі газеты фізіка-матэматычнага факультэта «За навуку» на усіх факультэтах выпускаюцца сатырычныя дадаткі: на філалагічным—«Будзьце знаёмы» і «Браты-журналісты», на геолага-геаграфічным—«Новости дня» і г. д. Усё гэта зрабіла насценныя газеты больш вострымі, баявымі, дзейснымі і цікавымі.

У гэтым годзе партыйныя і камсамольскія арганізацыі удзяляюць больш увагі насценнаму друку. Дастаткова сказаць, што некаторыя рэдкалегіі газет, як «За навуку» на фізіка-матэматычным і «Исследователь» на геолага-геаграфічным факультэтах, рабілі справаздачу на адкрытых партыйных сходах. Рэдкалегію газеты «Журналіст» заслухала партыйнае бюро філфака.

Значна палепшыла сваю работу рэдкалегія газеты «Слова філолага» (рэдактар В. А. Захарава). Газета удзяляе вялікую увагу пытанням вучэбнай і навуковай работы, сістэматычна прапагандуе вопыт выдатнікау вучобы, дабіваецца дзейснасці апублікаваных матэрыялау. Неаднаразова пасля выхаду чарговага нумара на курсах праводзіліся комсамольскія сходы па абмеркаванню выступленняу і прыняццю адпаведных мер.

Ва універсітэце прайшоу агляд-конкурс насценнага друку. I першае месца не выпадкова прысуджана рэдкалегіі «Слова філолага». Хочацца адзначыць, што заваяваць першае месца лягчэй, чым яго утрымаць. Філолагі павінны звярнуць увагу на афармленне нумароу (пакуль яны не адпавядаюць узрастаючым патрабаванням). Слабымі з'яуляюцца перадавыя артыкулы, газета пакуль не сябруе з многімі літаратурнымі жанрамі. Не заусёды удалыя малюнкі у сатырычных дадатках. Каб палепшыць газету, сілы на факультэце хопіць, і, абапіраючыся на аутарскі актыу, гэта неабходна зрабіць.

Лепшымі сталі газеты геолага-геаграфічнага факультэта «Исследователь» (рэдактар Л. Карпава) і юрыдычнага—«Советский юрист» (рэдактар В. Вострыкау), якія занялі другое месца. Сярод членау журы агляда-конкурса зайшла спрэчка, якім газетам прысудзіць другія месцы. Рэдактар газеты «Советский химик» I. Сіманава даказвала, што іх газета павінна быць абавязкова на другім месцы.

Часткова з гэтым можна згадзіцца. Рэдкалегія насценнай газеты хімічнага факультэта у гэтым годзе палепшыла сваю работу: часта узнімала надзённыя пытанні, адклікалася на важныя агульнапалітычныя і агульнауніверсітэцкія падзеі і мерапрыемствы. Але у газеце адсутнічае самае галоунае—дзейснасць матэрыялау. Тав. Сіманава не змагла назваць ніводнага «выпадку», каб па указанню рэдкалегіі было праведзена абмеркаванне крытычных матэрыялау.

Зусім іншая справа з газетамі «Исследователь» і «Советский юрист». У мінулым годзе яны былі у ліку адстаючых, а цяпер да іх голасу прыслухоуваюцца на факультэце.

Лепш, чым у мінулым годзе, працуюць рэдкалегіі насценных газет фізіка-матэматычнага факультэта «За навуку» (рэдактар Р. Жбанкоу) і біялагічнага—«За мичуринскую биологию» (рэдактар А. Карташова). Аднак іх газеты, змяшчаючы важны і патрэбны матэрыял, не змагаюцца за іх дзейснасць, часам застаюцца рэгістратарамі фактау і падзей.

Журы конкурса адзначыла, што крайне нізка пастаулена работа рэдкалегіі газеты «Студент истфака» (рэдактар Б. Гадуноу). Выходзіць насценгазета ад выпадку да выпадку, запауняецца таксама выпадковымі матэрыяламі. Цяжка лічыць «Студента истфака» насценнай газетай ВНУ, яна больш падобна на вучнёускую і, безумоуна, не прыносіць належнай карысці у выхаванні студэнтау.

Побач з гэтым, журы конкурса адзначыла, што і рэдкалегія газеты «Журналіст» працуе ніжэй магчымасцей. Хоць на аддзяленні рыхтуюцца журналісцкія кадры і ёсць рад кваліфікаваных журналістау са складу выкладчыкау, газета выходзіць рэдка, матэрыялы, якія змяшчаюцца у ёй, часам недастаткова апрацаваны, не вызначаюцца арыгінальнасцю пастаноукі і вырашэння надзённых пытанняу жыцця аддзялення. Рэдкалегія не заусёды дабіваецца дзейснасці друкуемых матэрыялау. Журы лічыць, што на аддзяленні журналістыкі газету трэба выпускаць значна часцей, матэрыялы павінны адрозніваццa прафесіянальнай спеласцю і навінамі пастаноукі пытанняу.

З насценных газет «Бюллетеней СНО», прадастауленых на конкурс, першае месца прысуджана навуковаму бюлетэню біялагічнага факультэта (рэдактар Е. С. Паповіч). Трэба адзначыць, што гэты бюлетэнь ужо другі год трымае першынство. Актывізавалі сваю работу «Бюллетени СНО» хімічнага і геолага-геаграфічнага факультэтау, чаго нельга сказаць аб навуковых бюлетэнях фізіка-матэматычнага і філалагічнага факультэтау.

Зусім дрэнная справа з факультэцкімі спартыунымі насценнымі газетамі і газетамі інтэрнатау. Яны вельмі нізкія па свайму зместу і выходзяць надзвычай рэдка.

Праведзены агляд-конкурс паказау, што многія газеты не адыгрываюць ролі арганізатара на факультэтах толькі таму, што нясмела прыцягваюць аутарскі актыу і не заусёды даводзяць свае крытычныя выступленні да канца.

**М. ПІЛЬШЧЫКАЎ,**
**член камітэта ЛКСМБ БДУ.**




## ЯНЫ СТАЛІ ПЕРШАРАЗРАДНІКАМІ



*Е. Ермалаеву—пяцікурсніцу хімічнага факультэта—ва універсітэце ведаюць як добрую спартсменку. Яна мае першы разрад па стральбе з малакалібернай вінтоўкі.*

*Зараз Ермалаева рыхтуецца да здачы дзяржаўных экзаменау. Пажадаем ей, як і у спорце, вытрымаць яшчэ адно выпрабаванне—выдатна здаць выпускныя экзамены!*

* * *



*Студэнт V курса геолага-геаграфічнага факультэта Нікіцін ужо чацверты год займаецца стралковым спортам. Прышоушы у секцыю да трэнера Н. Г. Лыкіна, малады спартсмен настойліва працавау над паляпшэннем сваіх дасягненняу. Некалькі разоу на спаборніцтвах Нікіцін набліжауся да нормы першага разраду, ды заусёды нехапала 5—7 ачкоу, што не дазваляла яму стаць першаразраднікам.*

*Але настойлівасць спартсмена перамагла: у мінулым годзе Нікіцін выканау першаразрадны нарматыу на першынстве ВНУ г. Мінска па стральбе.*

## ПАСТАНОВА

**прафкома і камітэта комсамола БДУ імя В. I. Леніна аб рабоце студэнтау у час летніх канікул.**

**У час летніх канікул студэнты універсітэта могуць аказаць значную дапамогу калгасам і прадпрыемствам у правядзенні палітыка-выхавауч ай і культурна-масавай работы, а таксама непасрэдным удзелам у сельскагаспадарчых работах калгасау.**
**Зыходзячы з гэтага, прафком і камітэт комсамола**

**пастанауляе:**

**1. Усім студэнтам па месцу правядзення летніх канікул аказваць дапамогу комсамольскім арганізацыям і культурна-асветным установам у правядзенні культурна-выхавауч ай работы (чытанне дакладау, лекцый па пуцёуках камітэта комсамола, удзел у выпуску насценных газет, у рабоце клубау і г. д.).**

**2. Студэнтам, якія жывуць у сельскай мясцовасці, за час летніх канікул адпрацаваць у калгасах не менш 10 дзён.**

**3. Студэнты, якія жывуць у г. Мінску і іншых гарадах, абавязаны пасля здачы экзаменау адпрацаваць на абсталяванні ціра, спартыуных пляцовак на тэрыторыі універсітэцкага гарадка або у падшэфным калгасе «Комінтэрн».**

**4. Адказнасць за работу студэнтау ускладаецца на прафсаюзныя і комсамольскія бюро факультэтау, куды студэнты павінны прад'явіць даведкі аб праробленай рабоце да 10 верасня 1956 г.**

**5. Старшыням профбюро і сакратарам комсамольскіх бюро факультэтау не пазней 5 чэрвеня 1956 г. падаць у камітэт комсамола спіскі студэнтау, указаных у п. 3.**

**Старшыням профбюро факультэтау і сакратарам комсамольскіх бюро да 15 верасня 1956 г. паведаміць аб выкананні пастановы.**

**Сакратар камітэта комсамола Е. БАБССАЎ,**
**Старшыня прафкома Д. МАРЧАНКА.**

# Выдатны драматург Генрык Ібсен

***(Да пяцідзесяцігоддзя з дня смерці)***

За поувека, што прайшоу з дня смерці Генрыка Ібсена, выразна абазначыліся маштабы яго творчасці, як стваральніка глыбока гуманнай, ваяуніча-ідэйнай і праблемнай драматургіі. У год смерці пісьменніка Г. Плеханау заявіу: «У асобе Генрыка Ібсена зышоу са сцэны адзін з самых захапляючых дзеячоу сучаснай літаратуры». I гэта было так. Вось ужо многія гады на рускай, а затым на савецкай сцэне з вялікім поспехам ідуць творы выдатнага нарвежскага драматурга.

Усёй сваёй творчасцю, поунай нястрымнага шукання праўды і выкрыцця хлусні, што разбурае і чалавечую асобу і грамадства, Ібсен паказвау хаця і маленькі сярэднебуржуазны, але непамерна вышэйшы нямецкі свет, «у якім людзі яшчэ валодаюць характарам, здольны да ініцыятывы і дзейнічаюць хаця часта з пункту погляду іншаземных паняццяу даволі дзіуна, але самастойна» (Ф. Энгельс). У нацыянальнай старыне з яе гераікай і у акружаючай сапрауднасці Ібсен сімпатызавау таму, што было праявай вызваленчых тэндэнцый. Ён стварыу рад нацыянальна-гераічных драм, у якіх станоучыя героі рэзка супрацьстаялі сучасным буржуа. Патрыятызм Ібсена быу варожы нацыяналізму нарвежскай буржуазіі і пастаянна узбагачауся тым, што вялікі пісьменнік бачыу за рубяжом, дзе адбываліся у той час важныя гістарычныя падзеі. Усе творчыя шуканні Ібсена пранізвае, як пісала К. Цэткін «страснае імкненне да новага свету праўды, прыгажосці і свабоды, да краіны радасці, дзе жывуць людзі, не ведаючы іншага закону акрамя уласнай волі, не ведаючы іншых граніц сваёй дзейнасці, акрамя інтарэсау грамадства».

У двух выдатных драмах ідэй—«Бранд» і «Пер Гюнт»—Ібсен увасооіу свае самыя запаветныя маральныя шуканні. Герой першай з іх—нарвежскі пастар Бранд прапаведуе абнауленне грамадства праз абнауленне асобы, якой належыць «быць сабою упауне». Ён гіне з-за няздольнасці прыкласці да практычнага жыцця свае ідэалы.

Услед за «Брандам» і «Пер Гюнтам» Ібсен ставіць тыя-ж праблемы і у наступных сваіх творах. Яго крытыцызм у адносінах буржуазнага грамадства становіцца усё больш рэзкім і непрымірымым. У драмах «Кукальны дом» і «Здані» Ібсен выкрывае буржуазны уклад сям'і, у якім вельмі ярка адлюстроуваюцца грамадскія сувязі. Ён бічуе разбэшчаныя адносіны, якімі атручаны усе у сям'і фру Альбіны—гераіні драмы «Здані». Яна знаходзіць у сабе сілу выступіць супраць аджыушых правіл і вераванняу. Нягледзячы на варварскае насілле над п'есай «Кукальны дом» нямецкіх мяшчан, якія навязвалі Ібсену сентыментальную канцоуку вяртання Норы, аутар смела паказау велічнасць душы простай нарвежскай жанчыны.

У гэтай востраканфліктнай драме (яна засталася у памяці нашых гледачоу дзякуючы яе выразнаму сцэнічнаму увасабленню у Беларускім дзяржауным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы) Ібсен паказвае трагічнае жыццё высокароднай жанчыны Норы у хлусні кукальнага дома мяшчанскага шчасця. Па меры развіцця падзей Нора прыходзіць да бясспрэчнага вываду: крайне зневажальна жыць у палоне мнімага добрабыту і шчасця. Яна пакідае кукальны дом, дзе была толькі цацкай капрызнага мешчаніна.

Далёка за межы крытыкі хлусні сямейнага укладу буржуа выходзіць Ібсен у наступных сваіх творах. У п'есе «Доктар Стокман, або вораг народа» ён малюе канфлікт гуманнага героя з буржуазным грамадствам. Гэты герой—доктар Стокман—пераконваецца, што воды курорта, прыбыткамі якога узбагачаюцца акцыянеры, шкодны для хворых. Але, нягледзячы на красамоунае выкрыццё афер гаспадароу курорта, герой драмы застаецца зусім адзінокім. Больш таго, прадажнай прэсе удаецца прадставіць яго як ворага народа.

Плеханау у сваім эцюдзе «Г. Ібсен» указвау, што доктар Стокман з'яуляецца ахвярай як драпежнага і хлуслівага буржуазнага грамадства, так і дробнабуржуазнай стракатасці сваіх уласных пераконанняу і поглядау. Яго погляды характэрны для дробнабуржуазнай інтэлігенцыі Нарвегіі таго перыяду, калі рабочы клас у ёй яшчэ не стварыуся і нічым не нагадвау аб сабе у грамадскім жыцці краіны. У гэтай п'есе усё яшчэ моцна адчуваюцца супярэчнасці Ібсена, які шукау чыста маральных, пазапалітычных шляхоу пратэсту і барацьбы супраць буржуазнага грамадства і яго пануючай маралі. У той-жа час тут, як і у больш позніх п'есах—«Дзікая качка» і «Хеда Габлер», Ібсен паказвае бязмэтнасць такога пратэсту.

У самых позніх драмах Ібсен, па словах Ф. Мерынга, быццам-бы прадказвае гібель старога свету, які ён ненавідзіць і разам з тым не можа пакінуць. Трагічнай супярэчнасцю Ібсена з'явілася тое, што, рашуча адштурхнуушыся ад буржуазнай маралі і палітыкі, ён так і не змог зразумець, што толькі палітычная барацьба рабочых прывядзе да аздараулення грамадскага жыцця. Таму самыя станоучыя героі застаюцца высокароднымі адзіночкамі, далёкімі ад барацьбы мас.

Нарвежская буржуазія, ушаноуваючы Ібсена у дні яго 70-годдзя (у 1898 годзе), старалася прадставіць мяцежнага драматурга зусім бяспечным у сілу абстрактнасці яго ідэалау. Але пры усёй супярэчлівасці ібсенаускага светаразумення глыбока знамянальна яго думка: «Правыя тыя, хто у саюзе з будучым».

Таму, як пісала К. Цэткін, творчасць Ібсена палохае буржуазію, аказвае падтрымку пролетарыяту у гарачых бітвах супраць хлусні буржуазнага грамадства, робіць пролетарыят больш пільным, вучыць бачыць хваробы і заганы буржуазнага ладу.

Прагрэсіунае чалавецтва шануе Ібсена у нашы дні як выдатнага драматурга, чалавека высокародных ідэалау і вялікай сілы антыбуржуазных імкненняу.

**Д. ФАКТАРОВІЧ,**
**дацэнт.**

**Рэдактар А. ВОЛК.**

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, пакой 62, тэл. 2-07-19

АТ 07475. Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 641. Тыраж 2000